на сучаснасць, нават на «злобу дня»: праблемы «абустройства» сельскай гаспадаркі суверэннай Беларусі у канцы XX ст. Добрая чвэрць тэксту прысвечана асэнсаванню гэтай праблемы. У рабоце удала спалучаюцца падзеі і урокі мінулага з балючымі пытаннямі аграрнага сектару сучаснай беларускай эканомікі. Аутар манаграфіі не дае рэцэптау, а прадастауляе сістэмную інфармацыю, прымушае разважаць, параунouваць. Дасведчаны чытач высновы зробіць сам.

**А.А. Яноускі**
**А.Г. Каханоускі**

В.Ф. Шалькевіч. **Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі:** Навучальны дапаможнік. 2-е выд. Мн., 1999. 200 с.

Рэцэнзаваная праца – гэта вынік шматгадовых роздумау беларускіх даследчыкау і самого аутара, прафесара В.Ф. Шалькевіча, аб гісторыі нацыянальнай мыслі.

У працэсе сваей навуковай дзейнасці ён пастаянна адчыняе новыя, невядомыя для шматлікага чытача сюжэты з нашай традыцыі. Свае навуковыя пошукі В.Ф. Шалькевіч паспрабавау выкласці у якасці навучальнага дапаможніка, будучы прафесарам юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаунага універсітэта.

«Прадмова» перш за усё уяуляе цікавасць не толькі для студэнтау, але і для спецыялістау па гісторыі грамадскай думкі Беларусі. У ёй упершыню аутар паспрабавау абгрунтаваць «Гісторыю палітычнай і прававой думкі Беларусі» як спецыфічны прадмет, які адрозніваецца ад «Гісторыі палітычных і прававых вучэнняу». Аутар падкрэслівае розніцу паміж такімі паняццямі, як «вучэнне» і «думка». Ён зазначае, што «Гісторыя палітычных і прававых вучэнняу» мае дачыненне выключна да завершаных творау, а «Палітычная і прававая думка» – гэта перш за усё рэакцыя той ці іншай часткі грамадства на сучасную палітыку, заканадауства, судаводства, судауладкаванне і г. д.

Тут жа у «Прадмове» (§ 2) даецца класіфікацыя шматлікіх і разнастайных па форме першакрыніц. Звяртанне да іх, падкрэслівае аутар, не можа замяніць ніякае крытычнае выкладанне. У гэтай сувязі у канцы кожнай главы навучальнага дапаможніка прыводзіцца пералік аутэнтычных тэкстау, там жа даюцца тэмы прыкладных рэфератау і дакладау, навейшыя даследаванні па той ці іншай персаналіі.

Заслугоувае увагі перыядызацыя гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі, прадстауленая у дапаможніку. У яе аснову пакладзена сацыяльна-эканамічнае развіццё грамадства. Храналагічны час гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі аутар дзеліць на шэсць перыядау:

I. Палітычная і прававая думка Сярэднявечча (XI – XV ст.).
II. Палітычная і прававая думка у эпоху Адраджэння і Рэфармацыі (канец XV – XVI ст.).
III. Палітычная і прававая думка перыяду Контррэфармацыі і крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін (XVII – сярэдзіна XVIII ст.).
IV. Палітычная і прававая думка веку Асветы (другая палова XVIII ст.).
V. Палітычная і прававая думка канца XVIII – пачатку XX ст.
VI. Палітычная і прававая думка Савецкай Беларусі і беларускага замежжа.

У рэцэнзаванай працы асвятляюцца толькі чатыры перыяды развіцця гісторыі, г. зн. да канца XVIII ст.

У кожным перыядзе у сваю чаргу разглядаюцца тыя ці іншыя палітыка-прававыя тэарэтычныя паняцці і ідэі тых мысліцеляу, якія іх фармуюць.

Вывучэнне палітычнай і прававой думкі беларускага народа на працягу амаль што дзесяці стагоддзяу, якія ахоплівае дапаможнік, сведчыць пра разнастайнасць грамадска-палітычных поглядау мысліцеляу Беларусі – гэта адказы на злабадзённыя праблемы, пастауленыя перад дзяржавай і грамадствам тым ці іншым этапам канкрэтна-гістарычнага развіцця. Дадзеная «Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі» канстатуе, што грамадска-палітычныя погляды айчынных мысліцеляу у большасці сваёй адлюстроувалі погляды прагрэсіуных еурапейскіх мэтрау у гэтай справе.

Маючы на увазе, што кніга першы такі навучальны дапаможнік, таму і заувагі, выкладзеныя ніжэй, у першую чаргу менавіта будуць насіць вучэбна-метадычны характар.

Перш за усё, на мой погляд, трэба было б у канцы разделау прыводзіць невялікія тэксты ключавых першакрыніц, якія непасрэдна знаёмяць студэнта з той ці іншай ідэяй у яе першазданным выглядзе. У падобнага роду выданні не хапае імяннога і тэматычнага паказальнікау.

У крытычным матэрыяле належыць больш увагі удзяліць кампаратывісцкаму падыходу да з'явы. Перш-наперш параунoуваць думкі беларускіх мысліцеляу у кантэксце сусветнай палітычнай культуры, а таксама прасачыць, як тая ці іншая вядомая палітычна-прававая тэорыя адлюстроувалася, змянялася, успрымалася у розных асяродках грамадства на нашай Бацькаушчыне.

У заканчэнні хочацца падзякаваць прафесара В.Ф. Шалькевіча за тое, што яго першая у Беларусі «Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі» будзе садзейнічаць аб'ектыунаму разуменню нашай культурнай спадчыны у сусветнай супольнасці, а маладым даследчыкам дапамагаць глыбей, больш крытычна асэнсоуваць палітычна-прававыя з'явы.

**А.А. Лягчылін**

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm